


◆ «ПРАВДА» ЗАКЛІКАЕ ◆ ГЕОГРАФЫ Ў ШКОЛЕ ◆ *Філасофія і тры мушкецёры*
◆ ПАСВЯЧЭННЕ Ў СТУДЭНТЫ ◆ ПАМЯТКА КАМСАМОЛЬСКАМУ ВАЖАКУ
◆ **Дыялектыка фізфака** ◆ ГОСЦІ З ПАМІРА ◆ *«УЗЛЁТ» РАСЦЕ*


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 29 (642) Пятніца, 7 кастрычніка 1966 года. Год выдання XIX. Цана 2 кап.


## МАРА ЗБЫЛАСЯ

Кажуць, што выбар правільнага шляху ў будучае, выбар любімай прафесіі — вызначаюць месца чалавека ў жыцці. Вось чаму кожны малады чалавек, які адчыняе дзверы ў будучыню, доўга абдумвае сваю прафесію, шукае сваё прызванне. Дасягненне пастаўленай мэты — задача цяжкая, цярністая. Менавіта, мне так чамусьці здаецца, будзе такой нялёгкай дарога філосафа, дарога, на якую мы ступілі. Нас на першым курсе 25. Многія маюць багаты стаж працы на вытворчасці...

Наогул, выбар гэтай прафесіі не выпадковы. Мы штодзённа бачым у ёй шмат цікавага, незвычайныя далягляды для творчай думкі. Вось чаму на лекцыях ужо цяпер так многа паўстае пытанняў да выкладчыкаў. Слова «філасофія» зусім не выпадкова азначае «любоў да мудрасці». Філасофія — гэта не сума цікавых і захапляючых фактаў, не апавяданне пра трох мушкецёраў, якія разбураюць інтрыгі хітрага кардынала...

Хоць часу прайшло яшчэ мала, каб пазнаць усе цяжкасці і «мудрасці» філасофіі, але ўжо становіцца відавочна, што вывучэнне гэтай дысцыпліны патрабуе многа—многа працы. Але мы перадолеем усе цяжкасці, бо хочам авалодаць вяршынямі гэтай цікавай навукі.

Н. БЕЛЯКОВІЧ,
студэнтка першага курса філасофскага аддзялення.

## КРЫЛЫ НАРОДАЎ-БРАТОЎ

**Мінулай восенню беларускія пісьменнікі, у тым ліку і прадстаўнікі нашага універсітэта, былі гасцямі сонечнага Таджыкістана. Яны апявалі гэты край у вершах, паэмах, расказвалі свайму народу аб поспехах «мудрых дзяцей Паміра» у камуністычным будаўніцтве.**

**Добрай традыцыяй савецкіх народаў сталі іх паездкі адзін да другога. Рэспублікі абменьваюцца дэлегацыямі вучоных, рабочых і калгаснікаў, дзеячоў літаратуры.**

**5-га кастрычніка Мінск сардэчна сустрэў дарагіх гасцей, пісьменнікаў далёкага Таджыкістана. На другі дзень пачаўся тыдзень таджыкскай літаратуры. Шляхамі гасцей будуць месцы баявой і працоўнай славы беларускага народа. Таджыкскія браты сустрэнуцца таксама са студэнтамі.**

**Студэнты нашага універсітэта любяць таленавітую літаратуру радзімы Рудакі і Фірдоусі, Амара Хайяма і Хафіза, Айні і Турсун-задэ. Яны ведаюць, што ў гады Айчыннай вайны многія воіны — таджыкі мужна змагаліся ў беларускіх лясах і ў падраздзяленнях дзеючай арміі за вызваленне зямлі Купалы і Коласа з-пад прыгнёту гітлераўскіх захопнікаў. На беларускай зямлі мужнелі, а пасля сталі вядомымі таджыкскімі паэтамі Ашырмат, Назараў, Абдуджабар Кахары, Мухідзін Фархат. Праз усю Беларусь з пераможнымі бітвамі прайшоў паэт Хабіб Юсуфі, які аддаў сваё жыццё за Радзіму.**

**Нехта з паэтаў назваў дружбу нацый СССР крыламі народаў-сяброў. Так, дружба — гэта крылы нашага палёту, гэта сіла савецкай вялікай сям'і.**

**Хуш амэмед!**

**Шчыра запрашаем гасцей з Таджыкістану ў наш універсітэт — старэйшую навучальную ўстанову Беларусі.**

# САВЕЦКІ СТУДЭНТ

Маладыя гады—лепшая пара ў жыцці кожнага чалавека. Але юнацтва бывае асабліва цікавым толькі тады, калі яно сагрэта вялікай мэтай, калі маладое пакаленне беражна выхоўваюць, узбройваюць ведамі, умела рыхтуюць для слаўных спраў на карысць Радзіме. Іменна такімі клопатамі акружаны ў нас у краіне студэнты—заўтрашнія спецыялісты. Ім створаны ўсе ўмовы для жыццятворнай навукі, паспяховага авалодвання выбранай прафесіяй, для разумнага адпачынку.

«Партыя і далей будзе праяўляць пастаянныя клопаты аб развіцці вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, — гаварыў тав. Л. І. Брэжнеў у справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXIII з'езду партыі, — так, як у сучасных умовах непамерна ўзрасце неабходнасць у кваліфікаваных кадрах спецыялістаў. У бягучай пяцігодцы лік студэнтаў павялічыцца ў нас амаль на мільён чалавек. Краіна чэрпае кадры для гаспадарчай, партыйнай, дзяржаўнай, дыпламатычнай, ваеннай работы, усёй грамадскай дзейнасці галоўным чынам з ліку спецыялістаў, падрыхтаваных вышэйшай школай».

У гэтым годзе дружная студэнцкая сям'я значна павялічылася і складае цяпер без малога чатыры мільёны чалавек. Адкрыліся новыя інстытуты, факультэты і аддзяленні. Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў і ўдасканаленню кіраўніцтва вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у краіне», прынятая ў пачатку навучальнага года, паказвае вну галоўны шлях фарміравання новых спецыялістаў — ведаючых, перакананых, здольных рухаць наперад нашу эканоміку і культуру, паўсямесна зацвярджаць навуковыя метады гаспадарання.

Слова «студэнт» савецкія людзі вымаўляюць з вялікай цеплынёй. Яны перакананы, што студэнты вырастуць вартай зменай нашым вучоным, інжынерам, спецыялістам сельскай гаспадаркі, урачам, настаўнікам. І выхаванцы вышэйшай школы апраўдаюць гэтае давер'е.

Галоўная справа студэнтаў—няспынна авалодваць ведамі. Далучаючыся да навейшых дасягненняў навукі, яны разам з тым зацікаўлена вывучаюць культурную спадчыну народаў сваёй краіны, з глыбейшай павагай адносяцца да лепшых тварэнняў перадавой чалавечай думкі ўсіх эпох і народаў. Навучэнцы не спыняюцца на тым, што пазнаюць у аўдыторыях. Пад кіраўніцтвам сваіх прафесараў і выкладчыкаў яны ўдзельнічаюць у вырашэнні задач тэхнічнага прагрэсу, навуковай арганізацыі працы і кіравання вытворчасцю. Больш 400 тысяч студэнтаў вядуць навуковую і канструктарскую работу; у вну дзейнічае звыш 200 студэнцкіх канструктарскіх бюро і бюро эканамічнага аналізу. Нямала прац, выкананых студэнтамі, укараняецца ў практыку, экспануецца на выстаўках дасягненняў народнай гаспадаркі, публікуецца ў навуковых выданнях. З гэтага часу кожны год да трохсот лепшых студэнцкіх работ будуць адзначацца спецыяльнымі медалямі.

Гэтую грамадска карысную актыўнасць студэнтаў трэба падтрымліваць, больш развіваць. Вну неабходна яшчэ многае зрабіць для ўдасканалення вучэбнага працэсу, выхавання ў кожнага юнака, кожнай дзяўчыны пачуцця адказнасці за сваё навучанне і падрыхтоўку да працоўнай дзейнасці. Вялікую ролю ў гэтым павінны адыграць камсамольскія арганізацыі вну, органы студэнцкага самакіравання. Яны прызваны дапама-

(Працяг на 3 стар.).



**У мінулы суботні вечар у актавай зале галоўнага корпуса адбылася сустрэча першакурснікаў з прафесарамі, выкладчыкамі і студэнтамі-старшакурснікамі. Гэтая традыцыйная сустрэча стала сапраўдным святам для ўсяго універсітэта. На гэтым здымку вы бачыце першакурсніц з выкладчыкамі.**

**Многа цікавага расказалі сваім малодшым сябрам студэнты старшакурснікі, асабліва аб тым, як берагчы час.**

**Рэпартаж аб гэтай сустрэчы чытайце на 4-ай старонцы.**

## ПРАВЕРКА ПРАКТЫКАЙ

### Трывожны сігнал

Бадай, немагчыма знайсці сапраўднага настаўніка, які б не хваляваўся перад кожным чарговым урокам. Бо новы ўрок — гэта індывідуальная творчасць, творчасць непаўторная і непаджальная.

Асабліва хвалюешся, калі гэта твой першы ўрок у жыцці, а ты яшчэ студэнт, хоць і пятага курса, і калі за плячыма ў цябе асабліва небагаты багаж ведаў.

Хвалявалася і Раіса Палішчук.

Але званок звініць няўмольна і патрабавальна, і трэба 45 хвілін займацца з вучнямі, зрабіць свой першы ўрок, магчыма, і няўдалы, але самастойны. Тут ніхто не папраўіць: ні метадыст, ні старэйшы настаўнік, трэба прыпамінаць самому і метадычныя навыкі і матэрыял, клас не павінен выходзіць з поля зроку, неабходна ўважліва сачыць за адказамі.

Першы пробны ўрок у 49 мінскай школе, дзе праходзяць практыку студэнты геолага-геаграфічнага факультэта, давала Рая Палішчук. Напісан падрабязны канспект урока, усё прадумана з метадыстам Міхаілам Аляксеевічам Майракавым, атрыманы парады ад настаўніка геаграфіі.

Пачатак нядрэнны. Вучні добра падрыхтаваліся да заняткаў, ведалі праграмны матэрыял. І актыўнасць іх была высокая: 9 вучняў былі выкліканы да карты.

Але самая галоўная частка ўрока — наперадзе: тлумачэнне новага матэрыялу.

Так, тэма ўрока была складаная: «Маладыя горы Еўропы». Большасць вучняў ніколі не бачыла гор і расказаць пра іх вельмі цяжка, бо неабходна, каб у аўдыторыі было развіта прастораваe ўяўленне. І тут на дапамогу маладой настаўніцы павінны былі прысці геаграфічныя карціны, якіх так многа ў кабінетах геолага-геаграфічнага факультэта. На іх можна было б і ляднік паказаць, і марэны, і альпійскія лугі, і пояс лясоў, і многае іншае, чаго не можаш раскрыць словамі. Але, нажаль, іх не было на ўроку, таму атрымаўся голы пераказ падручніка, які не пакінуў ніякага следу ў вучняў, і маладыя горы Еўропы засталіся для іх таямніцай. У школе мала наглядных дапаможнікаў па геаграфіі, але студэнты не павінны лянавацца, а старацца прынесці і паказаць вучням усё, што толькі магчыма з універсітэта. Забыты быў пры тлумачэнні і хрэстаматыйны матэрыял, і макеты маладых і старых гор, якія бескарысна так і праляжалі на стале выкладчыка.

На словы Раі, поўныя роспачы: «з мяне настаўніка не будзе», вопытны настаўнік Іван Антонавіч Бажынскі слушна заўважыў:

— Трэба будзе толькі ваша стараннe і праца, штодзённая на набыццё ведаў.

Пецю Бурдыку я сустрэў на лесвіцы.

На маё пытанне, як прайшоў першы ўрок, Пеця задаволена кажа:

— Вельмі добра для першага разу.

Так сказалі мне і ў час разбору ўрока. Тэма ў мяне была складаная: «План і арыентаванне». А ў падручніку пра гэта напісана не больш, як паўстаронкі.

Практыкант пачаў урок з таго, што яшчэ ў першабытны час чалавеку неабходна было арыентавацца, каб знайсці дарогу ў сваю пяшчэру. Потым перайшоў да працейшых планаў, якія складалі людзі ў даўнія часы. А пры замацаванні матэрыяла праверыў у вучняў назіральнасць.

Першае расчараванне і першы поспех. Хочацца больш поспехаў і не хочацца бачыць пустым метадычны кабінет па геаграфіі. Для студэнтаў 5-га курса ён павінен стаць іх творчай лабараторыяй. Тады і няўдач будзе менш.

П. РОГАЧ.

## Справаздачы і выбары ў партарганізацыях

# ВОСТРА, АЛЕ СПРАВЯДЛІВА

Адбыўся справаздачна-выбарчы сход партыйнай арганізацыі гістарычнага факультэта. Са справаздачным дакладам выступіў сакратар парткома Д. Б. Мельцар. Дакладчык на канкрэтных прыкладах паказаў, што партыйная арганізацыя гістарычнага факультэта за справаздачны перыяд дабілася значных поспехаў у сваёй рабоце па павышэнню якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў, у выкананні рашэнняў XXIII з'езда КПСС. Павысілася паспяховасць студэнтаў, і ў першую чаргу, камуністаў. Партыйная арганізацыя, гістарычны факультэт у цэлым, ганарыцца выдатнікамі вучобы камуністамі тт. Траскуновым, Сітадубам, выпускнікамі Бараноўскім і Варанковічам. Ёсць пэўныя зрухі і ў навукова-даследчай рабоце. Дацэнт У. М. Сікорскі абараніў доктарскую дысертацыю, выкладчыкі М. Іоська і В. Баркан — кандыдацкія, аспірант А. Міхайлаў бліскуча абараніў дысертацыю па філасофіі ў Іенскім універсітэце на званне доктара філасофіі ГДР. Прычым, сваю дысертацыю ён напісаў і абараніў на нямецкай мове.

За справаздачны перыяд, адзначыў дакладчык, адбылося 21 пасяджэнне партыйнага бюро і некалькі агульных партыйных сходаў, на якіх абмеркавана каля 70 розных пытанняў.

Спыняючыся на рабоце грамадскіх арганізацый, дакладчык не пахваліў работу камітэта камсамола факультэта, які ўзначальвае т. Місуна, крытыкаваў народнага кантралёра студэнта Папова за тое, што ён сам парушаў вучэбную дысцыпліну і не апраўдаў аказанага давер'я.

Зусім не выпадкова, што даклад выклікаў ажыўленыя спрэчкі.

Першым выступіў сакратар камітэта камсамола факультэта т. Місуна. Спачатку прыходзіцца згаджацца, што крытыка ў адрас камсамольскага камітэта і ў яго адрас справядлівая. Але, прызнаўшы крытыку, т. Місуна спрабаваў перакласці віну за дапушчаныя недахопы ў рабоце, як кажуць, з хворай галавы на здаровую. Ён пачаў скардзіцца на тое, што, маўляў, сакратар партбюро т. Мельцар і член партбюро т. Скапцоў слаба цікавіліся справамі камсамола, што яны не ўнікалі ў сутнасць яго работы.

Довады прамоўцы ў сваё апраўданне былі настолькі неабгрунтаванымі, што камуніст Л. С. Абэцэдарскі павінен быў у сваім выступленні сказаць:

— Партбюро недастаткова займалася камсамольскімі справамі. Але прычына тут не тая, на што наракаў т. Місуна. Партбюро вінавата ў тым, што часам несур'ёзна адносілася да падбору кадраў. Вось і наш камсамольскі сакратар даволі няўдалая кандыдатура. Тав. Місуна вельмі раўнадушны да факультэцкіх спраў, камсамольскай работы. Гэтым усё і тлумачыцца.

Камуніст Л. С. Абэцэдарскі слушна зазначыў, што няўдала таксама падабраны калектыў рэдкалегіі насценнай газеты. Калектыў газеты складаецца са студэнтаў першага курса. Паўстае пытанне, ці ведаюць дэталёва жыццё факультэта першакурснікі? Не. Значыць, не могуць яны і ўсебакова асвятляць яго на старонках газет.

Тав. Абэцэдарскі крытыкаваў партбюро, што яно не ставіць у цэнтры ўвагі выдатнікаў вучобы. І на гэты раз ён зрабіў той жа папрок.

— Паглядзіце, — сказаў ён, — дзе вы знойдзеце Дошку гонару студэнтаў-выдатнікаў? Нідзе.

Камуніст т. Клімоўскі прысвяціў сваё выступленне разгляду работы групы народнага кантролю. Ён правільна падкрэсліў, што ў членаў групы народнага кантролю пакуль што не даходзяць рукі да праверкі працы над курсавымі работамі, праверкі наведвання заняткаў на вячэрнім аддзяленні.

Навуковая работа студэнтаў — гэта змест выступлення камуніста т. Загарульскага. Ён унёс канкрэтныя прапановы па замацаванню студэнтаў у навуковых гуртках, арганізацыі іх даследчай работы.

Былы сакратар партгрупы аспірантаў т. Асіпкоў скардзіўся на тое, што аспірантаў завельмі перагружаюць рознымі грамадскімі даручэннямі. Прыйшоў час таксама паклапаціцца аб побыце аспірантаў, якія жывуць у невялікіх пакоях па чатыры чалавекі.

Крытычным было таксама і выступленне дэкана факультэта камуніста П. З. Савачкіна. Ён гаварыў аб неабходнасці з першых дзён вучэбнага года ўмацоўваць вучэбную дысцыпліну, стан якой сярод першакурснікаў выклікае трывогу. Ужо за некалькі дзён пяць студэнтаў за парушэнне вучэбнай дысцыпліны атрымалі вымовы. Сярод атрымаўшых студэнтка Бялевіч. Яна не паехала капаць бульбу, заручыўшыся фіктыўнымі медыцынскімі даведкамі, якія даставала на медпункце літфонда. Як устаноўлена, такія даведкі (відаць, з дапамогай бацькі) Бялевіч брала і тады, калі вучылася ў школе. Прычым, хвароба яе хапала заўсёды ў той час, калі трэба было вызваліцца ад фізічнай працы. Вось тады ў яе картачцы з'явіўся чарговы запіс: «Пакупалася ў ваннай, адчула немач, вызваляецца ад практыкі на заводзе».

— З праявамі недысцыплінаванасці, — заключыў у канцы выступлення прамоўца, — трэба весці рашучую барацьбу ўсяму калектыву.

Увогуле справаздачна-выбарчы сход прайшоў даволі актыўна і крытычна. У прынятай пастанове намечаны канкрэтныя меры, накіраваныя на вырашэнне выяўленых недахопаў у рабоце партыйнай арганізацыі факультэта.

Выбраны новы склад партбюро, усяго 12 чалавек. Сакратаром зноў абраны Д. Б. Мельцар.

**А. БЛАКІТНЫ.**

**Праз месяц у студэнта VI курса фізічнага факультэта До Ван Мао абарона дыпломнай працы. А пасля яго сустрэнуць фабрыкі і заводы В'етнама. Працоўных поспехаў табе, До Ван Мао.**



# ПАЛІТЗАНЯТКІ ПАЧАЛІСЯ

**Арганізавана прыступілі да работы ў новым навучальным годзе тэарэтычныя семінары, гурткі і палітшколы сеткі партыйнай асветы нашага універсітэта. Першыя заняткі паказалі, што слухачы выяўляюць вялікую зацікаўленасць да тэорыі і практыкі камуністычнага будаўніцтва, да праблем міжнароднага рабочага руху. У некаторых гуртках вырашылі сітэматычна, да разгляду праграмнага матэрыялу, арганізоўваць субяседаванні па пытаннях унутранай і знешняй палітыкі КПСС.**

**На тэарэтычным семінары фізічнага факультэта (кіраўнік дацэнт А. В. Самускевіч), як і ў мінулым годзе, галоўным метадам работы будзе падрыхтоўка і абмеркаванне дакладаў па філасофіі прыродазнаўства. На першым занятку ўдзельнікі семінару абмеркавалі тэматыку дакладаў — гутарак. Яны зацікавіліся такімі актуальнымі пытаннямі, як матэрыяльнае адзінства свету ў аспекце сучаснага прыродазнаўства, праблемы канечнага і бясконцага ў сягоняшняй касмалогіі і іншыя.**

**У першыя дні кастрычніка заняткі адбыліся ва ўсіх 17 тэарэтычных семінарах, 6 школах па асновах марксізма-ленінізма і 15 палітшколах, якімі кіруюць дактары і кандыдаты навук, аспіранты.**

**Б. ІВАНОЎ.**

## НА ПАРАДКУ ДНЯ—СУВЯЗЬ НАВУКІ З ЖЫЦЦЁМ

# МЕЛІЯРАЦЫЯ І ГЕАГРАФІЯ

Адбыўся Вучоны Савет геолага-геаграфічнага факультэта. На ім было абмеркавана пытанне аб выніках абароны дыпломных работ студэнтамі факультэта. Старшыня Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі прафесар М. І. Касцюкевіч адзначыў, што тэмы дыпломных работ былі важнымі ў навуковым значэнні. На «выдатна» абараніўся 41 дыпламант, на «добра» 59 і на «здавальняюча» 12. Выпускнікі Жучкевіч, Сітнікава, Мыслівец атрымалі дыпломы «выдатнікаў». Такія поспехі нас радуюць, але не трэба лічыць, што задача абароны дыпломных работ у нас вырашана поўнасцю. У нас яшчэ не зжыты такія выпадкі, калі ў дыпломнай выпускніка нашага факультэта сустракаюцца граматычныя памылкі, работы мала ілюстраваны, у іх слаба выкарыстоўваецца статыстычная і матэматычная апрацоўка матэрыялаў.

Асаблівую цікавасць на пасяджэнні выклікаў даклад акадэміка АН БССР, загадчыка кафедры глебазнаўства і геалогіі прафесара І. С. Лупіновіча на тэму: «Праблемы меліярацыі і задачы геаграфаў». Акадэмік адзначыў, што партыя і ўрад вялікую ўвагу ўдзяляюць развіццю сельскай гаспадаркі, асабліва меліярацыі зямель у нашай краіне. Раней меліярацыяй займаліся самі калгасы і саўгасы, але яна часам праводзілася без уліку апошніх дасягненняў навукі і тэхнікі і гэта не магло адмоўна уплываць на ўраджайнасці глебы. Цяпер гэты сектар работы будзе выконвацца за кошт дзяржавы і ў шырокім плане. Меліярацыя зямель можа выклікаць як дадатныя, так і адмоўныя з'явы. Так, напрыклад, пры паніжэнні ўзроўня вады адбываецца ўсыханне зямлі, паміpae рыба ў ставах і рэках. Таму меліярацыя павінна быць не аднабаковай, а комплекснай, якая б апіралася на глыбокія даследаванні фізічнай, хімічнай і біялагічнай уласцівасцей глебы.

Лічаць што комплексная меліярацыя з рэгуляваннем рэжыма вады вельмі дарагая. Але толькі адзін спуск вады (дрэнаж глебы), які танна абыходзіцца, аказваецца ў далейшым вельмі дарагім, таму што прыводзіць да зніжэння ураджаю за кошт усыхання падзолістай і пясчанай глебы, да ператварэння яе ў бясплодныя пяскі.

Ва умовах Беларусі атмасфернай вільгаці менш, чым патрэбна раслінам, асабліва ў маі і чэрвені. Такім чынам меліярацыю нельга праводзіць без рэгулявання воднага рэжыму і неабходнай умовай тут павінна быць зберажэнне максімума вады. Выканаць гэта немагчыма без уліку мясцовых прыродных умоў. Таму для правядзення навукова-абгрунтаванай меліярацыі глебы географам неабходна даць комплекснае даследаванне зямных плошчаў, на аснове якога можна скласці спецыяльную карту фізіка-геаграфічнага раяніравання.

Бліжэйшай задачай факультэта з'яўляецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія б змаглі займацца пытаннямі меліярацыі глебы, дапамагаць працаўнікам вёскі вырашаць і іншыя пытанні.

Пры абмеркаванні гэтага цікавага даклада выступілі прафесары М. І. Касцюкевіч А. Г. Мядзведзеў, А. Х. Шкляр, дацэнт М. Т. Раманоўскі і іншыя. Яны як і дакладчык, унеслі канкрэтныя прапановы па далейшаму ўмацаванню сувязі навукі і практыкі.

**М. ЧАРТКО,**
**асістэнт кафедры глебазнаўства і геалогіі.**

# МАТЭМАТЫКА КРОЧЫЦЬ У ЖЫЦЦЁ

**З кожным годам усё больш пашыраецца роля матэматыкі ў вытворчасці. Новыя запатрабаванні тэхнікі, далейшая яе аўтаматызацыя і механізацыя вытворчых працэсаў не могуць быць вырашаны без вылічальнай матэматыкі. Значэнне гэтай галіны навукі асабліва ўзрасло за апошняе дзесяцігоддзе, калі пачалося інтэнсіўнае пакарэнне касмічных прастораў. Узрастаючае выкарыстанне матэматыкі ў вытворчасці ставіць на парадак дня падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў. Характэрна, што цэнтрам матэматычных даследаванняў, а таксама падрыхтоўкі матэматыкаў для рэспублікі стаў наш універсітэт. Нядаўна тут адбыўся аднадзённы семінар матэматыкаў.**

**Буйны вучоны краіны, акадэмік АН БССР Ф. Д. Гахаў зрабіў цікавы даклад на тэму: «Асноўныя прынцыпы курса «Вышэйшая матэматыка ў вну». У ім прамоўца падрабязна спыніўся на ролі і значэнні матэматыкі ў вытворчасці, на спецыфіцы метадаў выкладання матэматыкі ў вышэйшай школе. Семінар прайшоў арганізавана. У яго рабоце прынялі ўдзел выкладчыкі кафедраў агульнай матэматыкі, матэматычнай фізікі, аспіранты і студэнты.**

**А. КУЗЬМІН.**

# *«Узлёт» бярэ разбег*

*Адбылося пасяджэнне літаратурнага аб'яднання «Узлёт». На яго сабралася, акрамя ўжо вядомых вам паэтаў Эдуарда Зубрыцкага, Уладзіміра Дзюбы, Юркі Голуба, Галіны Панько, і маладое папаўненне, якое прышло ў гэтым годзе на вучобу ў наш універсітэт. Многія з іх знаёмы вам са старонак малаадзёжных газет (Аляксандр Разанаў, Яўгенія Анішчыц) і іншыя.*

*Члены літаб'яднання выказалі пажаданне, запрашаць на пасяджэнні вядомых беларускіх паэтаў, а таксама падрыхтаваць новы зборнік вершаў да 50-годдзя Савецкай улады і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна.*

*Пажадаем творчай працы і поспехаў маладым паэтам.*

*М. ЯРАЦ.*



**ВОСЕНЬСКІ ЭЦЮД.**
Фота А. Кадзета.

# САВЕЦКІ СТУДЭНТ



ЛЮДА БАРБУК — ВЫДАТНІЦА ВУЧОБЫ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

гаць сваім таварышам рацыянальна размеркаваць бюджэт часу, узяць пад кантроль іх самастойныя заняткі, працэс практыкі, даследчую работу.

Студэнты ўжо з першага курса пачынаюць авалодваць грамадскімі навукамі, прыцягвацца да вывучэння цудоўных рэвалюцыйных традыцый старэйшых пакаленняў. Сістэма выкладання, праверания жыццём метады выхавання садзейнічаюць таму, каб жыватворныя ідэі марксісцка-ленінскага вучэння ператвараліся для маладых людзей у цвёрдыя перакананні. Адсюль — высокая свядомасць студэнцкай моладзі, яе гарачая зацікаўленасць у лёсе свайго народа, дзяржавы.

У гэтым навучальным годзе трэба яшчэ больш павысіць ролю рэвалюцыйнай тэорыі ў фарміраванні камуністычнага светапогляду будучых спецыялістаў, іх ідэйнай загартаванасці. Для гэтага ёсць усе магчымасці. Нядаўна зацверджаны новыя праграмы і новая сетка гадзін па курсах грамадска палітычных дысцыплін. Ужываюцца меры для ўмацавання кафедр грамадскіх навук кваліфікаванымі, тэарэтычна добра падрыхтаванымі кадрамі. Безумоўна, вялікую зацікаўленасць у дапытлівай студэнцкай моладзі выклікае Ўсесаюзны конкурс студэнцкіх работ па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ, міжнароднага руху моладзі, прысвечаны 50-годдзю Савецкай улады. І вельмі важна, каб у ім удзельнічала як мага больш моладзі.

Ідэйная перакананасць нашых студэнтаў, іх палітычная свядомасць праяўляюцца не ў гучных фразах, а ў канкрэтных карысных справах. Хто не чуў, напрыклад, аб студэнцкіх будаўнічых атрадах? У дні летніх канікул яны працавалі па ўсёй краіне. Рукамі студэнтаў пабудаваны тысячы жывёлагадоўчых памяшканняў у саўгасах, узведзены будынкі новых школ, клубаў, бальніц, пракладзены сотні кіламетраў чыгуначнай дарогі і ліній электраперадач. Студэнцкія будаўнічыя атрады — цудоўная школа выхавання. Іх праца, пабудаваная на прынцыпах добраахвотнасці і строгай дысцыпліны, жыццё па прынятых самымі маладымі будаўнікамі статуту і законах выхоўваюць арганізатарскія навыкі, уменне гаспадарыць. Усё лепшае, карыснае з гэтага вопыту трэба абмеркаваць, уважліва вывучыць і выкарыстаць для ўзбагачэння выхаваўчага працэсу ў вну.

Нашы студэнты, як і ўся савецкая моладзь, па праву лічаць сябе заўтрашнімі гаспадарамі краіны, паслядоўнікамі і прадаўжальнікамі вялікіх падзей, слаўных традыцый старэйшых пакаленняў. На занятках, у сваіх клубах, гуртках студэнты старанна вывучаюць гісторыю рэвалюцыйнага руху, гераічнае мінулае сваёй краіны. Сярод дэлегатаў другога Усесаюзнага злёту пераможцаў паходу па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народу было нямала прадстаўнікоў студэнцтва. Ад імя ўсіх сваіх сучаснікаў яны пакляліся мацаваць велічнасць Радзімы, натхнёнай працай і энергіяй ствараць будучыню, расці аддадымі справе камуністаў.

Трэба дапамагаць студэнтам і далей укараняць у канкрэтныя справы іх высокія ідэйныя імкненні, гатоўнасць аддана служыць свайму народу. Аб гэтым павінны паклапаціцца перш за ўсё партыйныя і камсамольскія арганізацыі.

Навучальны год у разгары. Няхай жа для ўсіх студэнтаў ён будзе яшчэ адным значным крокам наперад на шляху да высокай мэты — стаць добрымі спецыялістамі, актыўнымі і свядомымі ўдзельнікамі камуністычнага будаўніцтва.

(«Правда», 3 кастрычніка 1966 г.).

## АСНОВА ВЕДАЎ

Семінар... З ім мне даводзілася мець справу яшчэ ў школе. Семінары, хоць іх, праўда, было і нямнога ў нас праводзіліся, калі вывучалі гісторыю СССР і грамадазнаўства.

І вось толькі цяпер, у гэтым годзе, калі я паступіў ва універсітэт і пачаў вывучаць гісторыю КПСС, мне ўдалося поўнасцю раскрыць мнагазначнае слова «семінар».

Да гэтага часу мы ўжо дэтальна азнаёміліся з «Маніфестам Камуністычнай партыі» К. Маркса і Ф. Энгельса, з некаторымі працамі Пляханава. Цяпер пачалі падрабязна вывучаць буйнейшую працу Ул. І. Леніна «Што рабіць?» Па гэтай тэме мы з увагай выслухалі змястоўную лекцыю выкладчыка В. С. Багданава. Але праслухаць лекцыю і прачытаць падручнік аказалася зусім мала, каб актыўна ўдзельнічаць у спрэчках на семінары.

Цяпер семінарскія заняткі ў групе праходзяць даволі актыўна, і выкладчыца Я. І. Розіна застаецца задаволенай нашымі адказамі.

І. ВАШКЕВІЧ, студэнт першага курса матэматычнага факультэта.

## НЯХАЙ КВІТНЕЕ УНІВЕРСІТЭЦКІ САД

*У чэрвені гэтага года была апублікавана Пастанова ўрада аб арганізацыі калектыўных садоў работнікамі вытворчасці і ўстаноў. Пастанова дае магчымасць выкладчыкам, навуковым супрацоўнікам нашага універсітэта арганізаваць калектыўны сад.*

*У гэтым артыкуле мне хочацца звярнуць увагу на аснову гэтага даволі карыснага і цікавага мерапрыемства. На маю думку, сутнасць калектыўнага сада заключаецца не ў тым, каб сабраць багаты ўраджай яблык, груш.*

*Праца ў калектыўным садзе з'яўіцца адным з найбольш эфектыўных сродкаў умацавання здароўя, прафілактыкі розных захворванняў у адносінах нервовай і сардэчна-сасудзістай сістэмы. Для людзей разумовай працы занятак на свежым паветры стане найбольш спрыяльнай умовай для актыўнага адпачынку сярод прыроды. І, па-мойму, ён будзе найбольш спрыяльны яшчэ і тады, калі ў садзе пабудаваць спартыўныя пляцоўкі. Можна гэтаму мерапрыемству было б надаць значэнне для здароўя супрацоўнікаў вну і як магутнага, карыгіруючага фактара.*

*У Пастанове ўрада ёсць вельмі важная акалічнасць. Членам садовага таварыства дазваляецца будаваць летнія дамы. Таму ў садзе змогуць праводзіць летні адпачынак члены нашых сем'яў. Эфектыўнае значэнне набудзе сад і ў выхаванні сям'і. Нам часта даводзіцца скардзіцца на тое, што ў сям'і і школе выхаванне не дасягае па розных прычынах неабходнага ўзроўню і гэтае ўпушчэнне выяўляецца ў форму хуліганства сярод падлеткаў.*

*Я глыбока перакананы, што прывіццё ўлюбёнасці да працы стане лепшым сродкам у барацьбе са шкоднымі бацыламі маральна-бытавога разлажэння. Карацей кажучы, тут для кожнага знойдзецца цікавы занятак.*

*Акрамя выхаваўчага значэння наш сад можа прынесці вялікую карысць дзецям і ў агульнай адукацыі. Тут будзе сапраўдная, цесная сувязь школы з жыццём. Штодзённыя назіранні над жывой прыродай на многа папоўняць фактамі веды, якія атрыманы ў школе. З другога боку, гэтыя назіранні могуць паставіць новыя пытанні ў галіне жывой прыроды, з якімі дзеці прыедуць і на вучобу.*

*Дарэчы, арганізацыя універсітэцкага калектыўнага саду ў нас ужо мае гісторыю. У 1959 годзе мясцком універсітэта заслухаў мой даклад на гэтую тэму, вырашыў усямерна стымуляваць пытанне аб арганізацыі калектыўнага сада. Было даручана намесніку старшыні мясцкома В. Ф. Чыгіру і мне правесці першыя крокі па рэалізацыі гэтага пачынання. Але нам не ўдалося штонебудзь зрабіць, таму што арганізацыя калектыўных садоў была спынена на некаторы час.*

*І вось у нас цяпер паявіліся ўсе магчымасці для таго, каб пасадзіць свой сад. Хачу звярнуцца праз газету да супрацоўнікаў універсітэта ўзяцца за гэтую карысную справу.*

*Г. С. ЮНЬЕЎ, прафесар.*

## МІНСК—ГАСЦІННЫ ГОРАД

**Нядаўна ў Мінскім планетарыі зарубежным студэнтам быў паказаны фільм «Зорнае неба над Мінскам». Госці азнаёміліся з умовамі культурнага адпачынку ў парку імя М. Горкага.**

**Цёпла сустракалі в'етнамскіх і афрыканскіх студэнтаў у дзіцячых садах №№ 125, 126 і36 г. Мінска. Сіламі дзяцей сада № 125 быў падрыхтаваны для гасцей канцэрт.**

**Адбылася сустрэча сакратара камітэта камсамола універсітэта Георгія Рылюка з в'етнамскімі і афрыканскімі студэнтамі падрыхтоўчага факультэта. У задушэўнай гутарцы ён асвятліў некаторыя пытанні з гісторыі Ленінскага камсамола, а таксама расказаў зарубежным сябрам аб дзейнасці камсамольскай арганізацыі універсітэта.**

## ЗАЎЖДЫ ПАМЯТАЙ

*Камітэт камсамола нашага універсітэта з дапамогай старэйшых таварышаў-камуністаў і сваіх актывістаў распрацаваў памятку для камсамольскага важака. Галоўная яе мэта — дапамагчы студэнтам, асабліва малодшакурснікам, якім даручана кіраваць моладдзю, правільна планаваць і арганізоўваць выхаваўчую работу, стаць прыкладам у вучобе, паводзінах, у выкананні грамадскіх даручэнняў. Ніжэй друкуюцца вытрымкі з гэтай памяткі.*

**Сёння з табой дзеляцца вопытам работы твае калегі. Але ведай, што жыццё няспынна ідзе наперад. Кожны дзень, кожная гадзіна прыносяць з сабой новае, невядомае, і ніякія парады і нататкі не могуць паспець за імклівым бегам жыцця. Ты павінен заўсёды адчуваць гэтае новае, імкнуцца да ўсяго таго, што неабходна ў тваёй рабоце, дзеля тваёй арганізацыі. Таму заўсёды будзь ініцыятыўным, прыслухоўвайся да думкі камсамольцаў, райся са старэйшымі, з камуністамі. Табе даручылі самае пачэснае—кіраваць, весці за сабой людзей.**

**Галоўнае ў тваёй рабоце — клопаты аб выхаванні чалавека. Цябе павінен цікавіць не толькі ўвесь калектыў, але і асобны чалавек. Самыя нязначныя дэталі тваіх паводзін заўважаюць людзі. Яны патрабуюць ад цябе шчырай дабраты, сціпласці, высокай культуры і ініцыятывы. Толькі сваім прыкладам у вучобе, паводзінах, заслугоўвай давер'е і павагу сяброў.**

**Заўжды памятай, дружа, што з цябе бяруць прыклад. Таму на ўсё ты павінен звяртаць увагу, сачыць, як ты размаўляеш з людзьмі, ці можаш ты быць цікавым субяседнікам. Ці ідуць да цябе людзі са сваімі прапановамі, просьбамі, думкамі! Калі не— зараз жа адшукай прычыну. Калі ёсць у тваёй арганізацыі скептыкі, песімісты, людзі, якія не вераць у сілу калектыва—гэта значыць, што справы ў ёй не зусім добрыя. Не старайся гэтага не заўважыць і неадкладна змяні стыль работы, выпраўляючы недахопы, што былі раней.**

**Іншы раз размова з моладдзю без усякай афіцыйнасці дае больш карысці, чым голыя заклікі і справаздачы.**

**Не хапайся за ўсё адразу. Вызначы галоўны напрамак сваёй работы. Ніколі не трэба кіравацца прынцыпам: «Усё зраблю сам». Шырэй уцягвай у грамадскую работу камсамольцаў. Гэта дасць ім магчымасць самастойна развівацца, быць ініцыятыўнымі і вызначацца высокай прынцыповасцю.**

**План сваёй работы заўсёды трэба абмяркоўваць з моладдзю. Размяркуй свой працоўны дзень так, каб і табе і тваім таварышам можна было схадзіць у кіно, тэатр, пасядзець над кнігай. Кожная хвіліна павінна быць максімальна выкарыстана. Важным будзе і тое, калі ты правільна вызначыш патэнцыяльныя магчымасці сваёй арганізацыі, пакажаш на справе тую мэту, якую можа вырашыць твой калектыў камсамольцаў. Табе дапаможа і тое, калі ты часцей будзеш раіцца з людзьмі, знойдзеш для кожнага справу па душы.**

**Не пакідай з-пад увагі ніводнага выпадку парушэння Статута ВЛКСМ. Неабходна, каб кожны камсамолец даваў справаздачу аб зробленым. Трэба весці дзённік камсамольскага жыцця, рабіць свайго роду летапіс выдатных спраў камсамоліі нашага універсітэта. Аформі стэнд з падборкай метадычнай літаратуры, ведай, што тваім бліжэйшым і лепшым памочнікам у рабоце будзе насценны друк. Часцей трэба праводзіць рэйды «КП», каб вынікі іх былі вядомы ўсім, апублікуй у газеце. Часцей рабі справаздачу перад камсамольцамі. Інфармуй перад кожным сходам іх аб выкананай рабоце, аб новых задачах.**

**У павестку дня схода часцей трэба ставіць пытанні, як выконваюцца камсамольцамі запатрабаванні Статута ВЛКСМ. Менш штатных дакладчыкаў, камсамольскія сходы павінны быць разнабаковымі і цікавымі. Неабходна часцей праводзіць сходы — дыспуты, тэматычныя вечары.**

# КЛЯТВА ПЕРШАКУРСНІКАЎ

Рэпартаж

*Актавая зала ўрачыста гудзела, віншавала, радавалася. Чулася песня.*

*Да трыбуны падыходзіць прарэктар па вучэбнай частцы Л. В. Валадзько, дэканы, загадчыкі кафедраў. Яны гавораць цёплыя, шчырыя словы віншаванняў. Старшакурснікі дружным хорам скандыруюць: «Дружа першакурснік! Штодзённа памятай пра адказнасць, якую на цябе ўскладае званне студэнта БДУ імя Ул. І. Леніна». І не паспелі яны гэта сказаць, як пачулася клятва першакурснікаў, у якой гаварылася, што яны ніколі не падвядуць сваіх таварышаў, што будуць старанна авалодваць навукай, перадавой марксісцка-ленінскай рэвалюцыйнай тэорыяй...*

*Хтосьці з пяцікурснікаў шэпча:*

*— У гэтым годзе дзяўчат паступіла больш, чым у мінулым, — і кідае зайздросны позірк на сінявокую Таню Клешчанка — першакурсніцу з хімфака.*

*Я падышоў да яе.*

*— Вось студэнцкі білет... Як гэта здорава?! Мне толькі 17 год! — з хваляваннем прамовіла яна.*

*У руках Тані кветкі. Яна пяшчотна трымае іх. Хто ўручыў іх ёй? Магчыма, яны прынясуць ёй радасць, шчасце...*

*Нечым незвычайная гэта дзяўчына. А ўвогуле — як і ўсе першакурснікі: Раіса Санько, Святлана Вешчанка, Люда Сухіна, Генадзь Курлоў, Васіль Мухін. Для іх у гэтым годзе гасцінна адчыніліся дзверы буйнейшай навучальнай установы рэспублікі — БДУ.*

*— Вядома, толькі стараннай, напорыстай працай, — зазначае Аркадзь Бухтароў, былы пастух калгаса імя Ільіча, што на Верхнедзвіншчыне, — можна авалодаць навукай...*

*Зноў песня, былыя радасці. Гляджу на неба, блакітнае — зорнае, цёплае. А як жа выглядаем адтуль зверху? Можа так, як мне здаецца, шчаслівыя, радасныя, як гэтыя першакурснікі...*

*Раніца. Высока над галавою ляцяць галубы. Стрэлкі гадзінніка асветлены сонечнымі праменнямі.*

*— Добры дзень, новы дзень вучобы, — гавораць першакурснікі. У іх на пяць год застаўся білет з прыгожа выведзенымі літарамі: «Студэнт (ка) Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна».*

*А. КАДЗЕТ.*



# ПІРАМІДА
## ПАЧЫНАЕЦЦА З АСНОВЫ

Відавочна, яшчэ ніводнага званка фізфак не чакаў так, як першага званка сёлетняга навучальнага года. Гэта быў асаблівы званок-рапарт: «Новы фізічны корпус гатовы, калі ласка, на заняткі!».

Вестыбюль і калідоры прасвечваюцца наскрозь. Вялізныя вокны, усе дзверы са шкла, і кожны сонечны праменьчык свабодна гуляе па паркеце і дрыжыць залатымі зайчыкамі на сценах. Шырокая лесвіца (па ёй так добра скакаць праз тры прыступкі, калі спазняешся на лекцыі), на якую нанізаны пяць паверхаў. Кожны ззяе, «як новенькі». Калідоры яшчэ неабжытыя, гулкія. Першакурснікі ходзяць па іх неяк бачком і яўна інакш, чым старшакурснікі. Яны тут самыя маладыя навасельцы. І таму яшчэ не могуць адразу «схопліваць» назвы кафедраў і лабараторый. З гэтай прычыны яны падоўгу затрымліваюцца перад кожнымі дзвярыма і старанна вывучаюць шкляныя шыльдачкі.

А шыльдачкі тыя ж самыя, што і былі раней, яны пераехалі сюды з дзвярэй галоўнага корпуса, дзе дагэтуль размяшчаўся фізфак. Праўда, тут ёсць тое-сёе, што хутка прымусіць спыніцца студэнтаў, якія маюць вопыт многіх экзаменацыйных сесій.

Чаму хутка, а не зараз? Таму што шыльдачак на некаторых дзвярах яшчэ няма. Але іх лёгка можна сабе ўявіць. Вось, напрыклад: «Лабараторыя тэлебачання». Такога на фізфаку раней не было. Уласна кажучы, лабараторыі ў поўным сэнсе гэтага слова яшчэ няма і цяпер. Ёсць пакой, завалены скрынкамі і апаратурай. На скрынках шматлікія перасцярогі і клічнікі: «Не кантаваць!», «Берагчы ад вільгаці!» і іншае. А адзін з гаспадароў будучай лабараторыі—Вячэслаў Сідаровіч, скінуўшы пінжак і ўзброіўшыся пыласосам, адразу ўзяўся за работу, праўда, пакуль што не навуковую: на кожным выцягнутым са скрыні тэлевізійным прыёмніку ці тэлекамеры ляжыць тоўсты слой пылу.

— Апошні пыл,—гаворыць Вячэслаў,—у нас такое абсталяванне не запыліцца...

Дзесяць крокаў далей па калідоры, і мы — у антэннай зале. Тут усе прыборы ўжо расстаўлены ў тым самым адзіна магчымым парадку.

Для Наташы Іванковай новы корпус — апошняя ступенька студэнцкага жыцця. Праз некалькі месяцаў у яе—абарона дыплома. Але часовым жыхаром яна сябе тут не адчувае, размясцілася з усімі зручнасцямі і прывычна шчоўкае выключальнікам.

— Ведаеце, як называецца гэты прыбор? «Астра». Паэтычна праўда? А наогул — прыбор для вымярэння каэфіцыента стаячай хвалі і каэфіцыента затухання. Ну што ж, мова паэзіі — усюды вышэйшая мова.

У любым кутку новага корпуса ад цокальнага паверха да паддашка можна сустрэць няўпэўненую асобу, рухомую ўсеагульным законам цікаўнасці: «А што там?» Гэтай «хваробе» падвергнуты ўсе — ад першакурснікаў да старшакурснікаў. Але першыя ўсё ж больш цікаўныя: іх цікавіць не толькі «А што там?», але і «А як там?». Ліза Кардаш і Жэня Каробка паставілі пытанне рубам:

— А якая кафедра самая цікавая?

Для вырашэння гэтай праблемы першакурсніцам прадстаўлены два з палавінай гады. А пакуль... пакуль што яны вывучаюць яе заблытаныя і шматлікія ўмовы ў сваіх аўдыторыях.

Але вось, нарэшце, мы падышлі да таго, з чаго пачынаецца кожны фізік — да вялікай фізічнай аўдыторыі. Раней яна знаходзілася ў старым корпусе. Тады яшчэ фізіка-матэматычнага факультэта. Потым з'явілася аўдыторыя больш прасторная і больш светлая—чатырыста трыццаць трэцяя ў галоўным корпусе. Там заўсёды праходзілі сходы курсаў. А цяпер маецца некалькі такіх у новым корпусе фізфака. Тут і размясціліся цяперашнія першакурснікі. Трэба сказаць, што ў іншых аўдыторыях яны проста не змаглі б памясціцца. Такая ўжо «дыялектыка» фізфака: у кожны наступны год на першы курс прымаецца амаль удвая больш студэнтаў, чым у папярэднім. На фізфаку займаецца паўтары тысячы чалавек. Ён нагадвае сабой піраміду, аснова якой— першы курс—з кожным годам павялічвае сваю плошчу і служыць надзейнай апорай усёй пірамідзе.

Сёння ў новым фізічным корпусе ўжо няма ўрачыстасці і святочнасці першага вераснёўскага дня. Пачаліся будні новага фізфака. Будні, якія заўсёды былі цяжкімі і ніколі—шэрымі. І, падпарадкоўваючыся іх рытму, кожны новы дзень падзяляе на часткі вялізны электрычны гадзіннік-званок, які ва універсітэце звініць неяк асабліва гучна, палохаючы з непрывычкі навічкоў і радуючы старажылаў.

**Б. ПАСТЭРНАК,**
**студэнт фізфака.**

# Фікусавыя інтэрпрэтацыі

ГУМАРЭСКА

АБ БІЯЛОГІІ Ў НАС, філолагаў, цьмянае ўяўленне. Памятаецца толькі тое-сёе з батанікі — «дэкаратыўныя расліны паглынаюць вуглекіслы газ і выдзяляюць кісларод», — усё ж такіх ведаў дастаткова, каб растлумачыць усхваляванасць студэнта, які заўважыў у аўдыторыі вялізны зялёны фікус.

— Родны ты мой! — магчыма, ўсклікнуў студэнт.—Ды як жа гэта? Адкуль?

Фікус маўчаў.

— Не давяраеш? Ну, нічога. У нас з усімі навічкамі так бывае. Пажывеш — пазнаеш. Ты толькі кіслароду нам падкідвай, а мы ўжо цябе не забудзем...

На другі дзень «крыніца бясплатнага кіслароду» пераканалася ў праваце асабістага недавер'я і зразумела, куды трапіла. Дэкаратыўным розумам фікуса авалодаў сум, расчараванне, а зялёнае з белымі абжылкамі цела пакрылася пылам і стала шэрым. Сумны студэнт, якога нядаўна высялілі з інтэрната за ўжыванне «зялёнага змія», намаляваў на шырокім лісці фікуса домік з акенцам і трохі паплакаў. Слёзы падалі на лісце і заставаліся на іх бруднымі плямамі.

Фікус плакаць не ўмеў. У душы ён спачуваў бедачыне. А пасля фікус застаўся адзін у ціхім калідоры корпуса.

— Ой, які непрыгожы,—сказала студэнтка, дакрануўшыся да лісця мініятурнымі пальчыкамі.

На трэці дзень лісце фікуса пажаўцела і звісла на галінках, нібы шырокія штаны Івана Нікіфаравіча з вядомай аповесці Гогаля.

— Як непрыемна бачыць такі фікус, — прыкмеціў зарана палысеўшы студэнт.

А трэба ведаць, што гэты лысун вывучаў эстэтыку.

На чацвёрты дзень пачаўся лістапад. У час кантрольнага дыктанту фікус зусім агаліўся. На падлозе шамацела лісце. Было неяк сумна, як у восеньскім садзе. На памяць аб буйнай фікусавай маладосці студэнты ў гэты дзень аўдыторыю не падмяталі.

На пяты дзень адбыўся адкрыты расшыраны камсамольска-прафсаюзны сход. На ім прысутнічалі члены таварыства «Чырвонага крыжа і Чырвонага паўмесяца». Заключнае слова ўзяла выздараўленчая камісія.

— Таварышы, — сказаў адзін з членаў гэтай камісіі, — для падтрымання жыццядзейнасці дэкаратыўнай расліны па прозвішчу «Фікус» рэкамендую перанесці яе ў новае, больш спрыяльнае асяроддзе.

Для гэтай урачыстасці запрашаўся духавы аркестр. Рэкламнае бюро ўхапілася абвясціць усім пра гэтую падзею, але ўхапілася толькі на словах...

Аркестр прышоў у такім складзе: гавайская гітара, акардыён і труба. Але гітара і акардыён аказаліся пакалечанымі. Тады труба дэманстратыўна, з сумным піскам пакінула працэсію. Кіраўнік аркестра хацеў набыць барабан і ім адбарабаніць гэтую ўрачыстасць, але барабана не аказалася, таму ён шаноўна працягнуў далонь да аднаго студэнта і прашаптаў:

— Дай 15 рублёў...

— Навошта?..

— На барабан збіраю.

— Ну, калі на барабан—вось мая рука і 15 капеек.

Кіраўнік засаромеўся і адышоў. Прамовы таксама не было. Члены камітэта і бюро спяшаліся ў сталовую. Толькі старэнькая прыбіральшчыца, зноў сустрэўшы фікус у калідоры, рашуча накіравалася ў дэканат. «Па асабістаму жаданню», — вырашыла занепакоеная бабулька. Але заявы так і не было. Так, недзе глыбока ў душы бабулькі крануліся ўспаміны. Некалі ў юнацтве яна любіла кветкі. Праўда, гэта было вельмі даўно... Усё ж яна не зволілася. Як пісаў уласны карэспандэнт факультэцкай насценай газеты, «у гэты момант перад вачыма старой прыбіральшчыцы прайшло ўсё яе жыццё, і яна вырашыла: «ніколі!» Кожны дзень, — працягваў уласны карэспандэнт, — студэнты адчуваюць прыемнае, калі заўважаюць, як клапатлівая бабулька старанна даглядае свайго выхаванца»...

Нядаўна ў час адпачынку пад пачынаючай ажываць засенню фікуса адбывалася наступная размова двух курыльшчыкаў:

— Пуф—пуф,... А фікус сабе нічога.

— Так, так. І заўваж, нешта паглынае.

Фікус паглынаў нікацін двума маленькімі светлымі лісточкамі, якія з'явіліся на яго макушцы...

**М. ПРАМІКАЎ.**

# Калейдаскоп дапытлівых

* **НАДЗЕЯ АНДРЭЯЎНА ДУРАВА** (1783—1866 гг.) уцякла ад сваіх бацькоў, пераадзелася ў мужчынскую вопратку, паступіла ва ўланскі полк і ваявала ў 1812 годзе супраць напалеонаўскіх захопнікаў. За храбрасць у баях была ўзнагароджана і атрымала званне афіцэра. Служыла ардынарцам пры штабе фельдмаршала Кутузава.

* **ПЕРШАЙ ЛЁТЧЫЦАЙ РАСІІ** была Л. Зверава, якой ў 1911 годзе было прысвоена званне «пілота-авіятара».

* **ПРАВОБРАЗАМ МІТРАФАНУШКІ** у «Недарослі» паслужыў Фанвізіну 18-гадовы дваранін Аляксей Аленін. Убачыўшы сябе на сцэне, усхваляваны Аленін перамог сваю схільнасць да гультаёў, перастаў бяздзейнічаць і ўзяўся за вучобу. З яго выйшаў самы адукаваны чалавек таго часу — прэзідэнт акадэміі мастацтва і дырэктар публічнай бібліятэкі.

* **КОЖНУЮ ХВІЛІНУ** на Зямлі памірае 108 чалавек, а нараджаецца 114. Штогод на Зямлі памірае 40 мільёнаў людзей, а нараджаецца 60. Гісторыя жыцця на Зямлі ад бялковай малекулы да чалавека заняла 4 мільярды год. У 1 000 годзе на Зямлі пражывала 275 мільёнаў чалавек. А цяпер больш трох мільярдаў. У 2 000 годзе насельніцтва Зямлі ўзрасце да 5 мільярдаў.

Рэдактар М. І. ЮСЬКА.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 112, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 01104 Зак. 1242.